**Міхно, У.** І хлеб возяць дэсантнікі / У. Міхно // Чырвоны прамень (Чашнікі). — 2007. — 31 ліп. — С. 3.

**І ХЛЕБ ВОЗЯЦЬ ДЭСАНТНІКІ**



Вы прыйшлі ў магазін за хлебам. Што ж, смачна з’есці! Ведаеце, мажліва, менавіта гэты бохан хлеба, які вы трымаеце ў руках, даставіў з хлебазавода... дэсантнік. Не, не на парашуце. На звычайнай «хлебнай» машыне, за рулём якой працуе Віктар Віктаравіч Пакатовіч.

Віктар на вадзіцеля вучыўся яшчэ да арміі. Сам ён родам з невялікай вёсачкі Чачанёва, што на Талачыншчыне. Пакуль бегаў у школу, дапамагаў бацькам-калгаснікам па гаспадарцы, не заўважыў, як прыйшоў час ісці ў войска. Атрымаўшы вадзіцельскія правы, Віктар і не здагадваўся, што служыць будзе ў 103-й Віцебскай паветрана-дэсантнай дывізіі. Накіравалі ў вучэбку ў Фергану на чатыры месяцы, а адтуль самалётам перакінулі ў Кабул.

Як бачым, дэсантнікі не толькі прыгаюць з парашутам, а, ледзьве прызямліўшыся, ірвуцца ў бой. Хлопец на пачатку трапіў у разведвальны ўзвод. Давялося не аднойчы хадзіць з баявымі сябрамі ў разведку. А затым, каб папоўніць панесшую значныя страты роту, яго «кінулі на прарыў» у аўтакалону вадзіцелем.Так Віктар Пакатовіч «пакатаўсся», бадай, па ўсім Афганістане. Катаўся б спакойна і бязбоязна, бо машына – яго стыхія, калі б не ішла ў той далёкай паўднёвай краіне крывавая бойня. Вайна ёсць вайна, вакол грымелі выбухі, страляніна, і кожны кіламетр дарогі мог у любы момант стаць апошнім. Калонамі па трыццаць–сорак машын вазілі на перадавую зброю і патроны, прадукты харчавання, так неабходныя на фронце.

Калі ўпешыню пад абстрэл трапіла калона, зрабілася не па сабе. Галаўную машыну падбілі. Часу на роздум не было, трэба вырывацца з засады. Вырваліся. А аднойчы ў Пандшэрскай цясніне на міне падарваўся аўтамабіль, які ішоў перад яго «Уралам». Адзін вадзіцель быў паранены, другі – кантужаны. За выбухам, зразумела, пачалася страляніна. Давялося і нашаму герою ўзяцца за аўтамат. Вораг быў нябачны, што яшчэ горш. Не бачыш па кім, але страляй, іначай заб’юць цябе.

Пад час другой паездкі ў Кандагар Віктарава машына ішла ў хвасце. На яго вачах разрыўною куляю насмерць параніла вадзіцеля, што вёў машыну наперадзе. Віктар, аднак, не пабаяўся выскачыць з кабіны і ўзяць тэхніку забітага вадзіцеля на буксір. Так і выехалі з-пад абстрэлу. За той учынак ён быў ўзнагароджаны медалём «За адвагу». Амаль два гады доўжыліся афганскія дарогі вадзіцеля Віктара Пакатовіча. Смелага куля баіцца. Абмінула яна і Віктара, хоць не раз ён быў сведкам смерці сяброў і саслужыўцаў. Бачыў сапраўднае пекла вайны. І вайна тая, хоць столькі мінула гадоў, яшчэ й зараз прыходзіць да яго ў кашмарных снах. І ўспамінаюцца сябры баявыя: зямляк Сяргей Будрэвіч, украінец Дзіма Лысенка. І ў такія хвіліны зноў, як і тады, не верыцца, што ўсё гэта некалі скончыцца. Скончыцца, абы толькі адкрыў вочы…

У Новалукомль прыехаў Віктар пасля арміі, каб сесці зноў жа за руль ужо мірнае машыны. Трынаццаць гадоў працаваў на аўтабазе, потым уладкаваўся на хлебазавод. Цяпер у яго прафесія самая мірная – вазіць хлеб.

І сыну, які ўжо ў падлетках бегае, перайшла ў спадчыну цяга да аўтамабіля. Усё часцей завіхаецца Васілёк ля бацькавай машыны. Хай вучыцца. А што, прафесія добрая. Вось толькі – каб вайны не было…

**У. Міхно**